Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. ПЯТНІЦА №203 (28567)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Работа ЖКГ удасканаліцца і пашырыцца**

СТАР. 3



**Хто расказвае нам пра надвор'е**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар СІРЭНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

*«Сенатары маюць намер прапрацаваць пытанні давання жылля і зніжэння падаткавай нагрузкі для маладых спецыялістаў у вёсцы, занятых у сацыяльнай і культурнай сферах. Да нас часта звяртаюцца маладыя людзі. І ў асноўным з бытавымі пытаннямі, якія ўзнікаюць з-за фармалізму на месцах. Стварэнне бытавых умоў — гэта першае, з чаго трэба пачынаць. Нагрузка на маладых спецыялістаў ужо значна большая, чым раней. Для чалавека, які апынуўся ў нязвыклых умовах, без падтрымкі бацькоў, якому яшчэ трэба выконваць працоўныя абавязкі, вырашаць бытавыя праблемы, — гэта занадта шмат. Што ж датычыцца таго, як даюцца льготы і надбаўкі да зарплаты маладым сельскім інтэлігентам, то ў межах заканадаўства ўжо зроблена нямала».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9577 | ▼ |
| Еўра | 2,3106 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0340 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0738 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17203>

9 771990 763008

# КАМЕННАЯ ЗАГАДКА ПРОДКАЎ



**Каменны крыж каля знікаючай вёскі Авечкі — малавядомы і малавывучаны артэфакт мінуўшчыны на поўначы краіны. Аляксандр ЯКУШЫН *(на фота)*, жыхар суседняй з Авечкамі вёскі Басянкі Мёрскага раёна, яшчэ з дзяцінства ведаў гэтае сакральнае месца, бегаў сюды з сябрамі, разглядаў выбітыя надпісы на камені, але ў той час мала хто цікавіўся такімі гістарычнымі аб'ектамі, а старэйшыя не тлумачылі дзецям пра крыжы.**

**— На жаль, абарвалася ніць памяці, і я не магу расказаць падрабязнасці аб гэтым помніку людзям, якія цікавяцца гісторыяй і краязнаўствам, — тлумачыць мой гід.**

**Але Аляксандр разумее і ведае галоўнае: гэты каменны крыж — сведка гісторыі зямлі, на якой жылі яго продкі, і гэта каменная загадка вартая аховы і вывучэння.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Сацыяльная падтрымка

## Кожнаму — свой утульны куток

### У Нясвіжскім раёне з'явіўся маладзёжны цэнтр для інвалідаў

**У Нясвіжскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў адбылося адкрыццё першага ў Беларусі аддзялення падвышанай камфортнасці для маладых інвалідаў. Ідэя стварэння такога сацыяльна значнага аб'екта з'явілася каля года таму.**

Чырвоную стужку перарэзалі старшыня Нясвіжскага райвыканкама Іван Крупко, начальнік упраўлення па працы, занятасці і абароне насельніцтва Таццяна Тоўсцік і дырэктар установы Генадзь Маляр. «У новым аддзяленні дома-інтэрната маладым людзям дадзена магчымасць развівацца, вучыцца, сябраваць, у гэтым і заключаецца яго ўнікальнасць. Абстаноўка, набліжаная да хатніх умоў, садзейнічае далейшай сацыялізацыі, пашырэнню формаў і тэхналогій сітуацыйнай дапамогі, удасканаленню сістэмы вольнага часу і развіцця інтарэсаў. Акрамя таго, тут маладыя людзі знаходзяцца пад наглядам спецыялістаў, у тым ліку медыцынскіх работнікаў», — адзначыў Іван Крупко.

У той жа дзень у раёне адбылася яшчэ адна падзея «ўпершыню». Кіраўніцтва Нясвіжскага раёна ўзнагародзіла грамадзян за валанцёрскую работу. Імі сталі чатыры актыўныя члены праваслаўнага брацтва Праабражэння Гасподняга (прыхода храма Святой Жыватачальнай Тройцы аграгарадка Салатанаўшчына Нясвіжскага дабрачыння): Таццяна Ермакова, Сяргей Маркевіч, Ала і Уладзімір Жураўскія, якія не першы год дапамагаюць жыхарам дома-інтэрната. Па словах кіраўніка брацтва Алега Абрамовіча, настаяцеля царквы, братчыкі імкнуцца дапамагаць установе і яе жыхарам і матэрыяльна, і маральна.

СТАР. 4

■ Шануй сваё!

## «Наша адзенне — душа народная»

### Пра традыцыі беларускага касцюма і сучаснасць

**Міжнародны кангрэс «Традыцыйны беларускі касцюм у еўрапейскай культурнай прасторы» ўчора прайшоў у Мінску. У ім прынялі ўдзел вядучыя навукоўцы Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы і Эстоніі. Там абмяркоўвалі, якое месца займае традыцыйны касцюм у сучасным жыцці, як можна выкарыстоўваць і развіваць каштоўную народную спадчыну ў сучасных умовах.**

СТАР. 4



Фота Кастуся ДРОБАВА.

# АСАБЛІВЫЯ АДНОСІНЫ

## У хуткім часе беларускі лідар можа наведаць Кубу

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кубы ў Беларусі Херарда Суарэсам Альварэсам — у сувязі з заканчэннем дыпламатычнай місіі апошняга.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы традыцыйна сустракаецца з дыпламатамі, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё адносін Беларусі і краін, што яны прадстаўляюць.

— Вы пазналі Беларусь, адчулі нашу краіну, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Вы для нас чалавек не чужы. Мы традыцыйна з савецкіх часоў з найвялікшай павагай ставімся да вас, да кубінскага народа, да кубінскай дзяржавы. Так будзе і надалей. Паколькі вы нямала ўклалі сваіх сіл у тое, каб гэтыя адносіны развіваліся і іх фундамент умацоўваўся.

Кіраўнік краіны канстатаваў, што ў сферы эканомікі ўстанавіліся ня дрэнныя адносіны. Для даведкі: аб'ём двухбаковага гандлю ў студзені—жніўні 2017 года склаў трохі больш за 50 мільёнаў долараў. У той жа час трэба ўлічваць адлегласць: нашы краіны знаходзяцца ў розных канцах свету, ды і эканамічнае становішча Кубы з-за шматгадовай блакады ЗША даволі цяжкае.

— У нас адзіныя погляды на сусветную павестку дня, у нас амаль няма разыходжанняў па пытаннях, якія ўваходзяць у яе, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Куба як нас падтрымлівала, так і падтрымлівае ў плане ўстанаўлення шчыльных адносін з сяброўскімі вам і, натуральна, нам краінамі Карыбскага басейна і Лацінскай Амерыкі. Нам бы вельмі хацелася мець з імі добрыя адносіны, безумоўна, заснаваныя на гандлёва-эканамічных пытаннях.

Менавіта пры актыўным садзейнічанні Кубы Беларусь уступіла ў якасці назіральніка ў Асацыяцыю Карыбскіх дзяржаў у студзені 2016 года. Акрамя гэтага, Беларусь і Куба дапамагаюць адна адной у ААН, Руху недалучэння, іншых міжнародных арганізацыях.

— Можа, вы больш дакладна валодаеце сітуацыяй у Венесуэле, сяброўскай нам краіне, і скажаце некалькі слоў пра яе, пра свае ўражанні. Я буду вам вельмі ўдзячны, — звярнуўся Прэзідэнт да кубінскага дыпламата.

Кіраўнік дзяржавы папрасіў пасла перадаць самыя цёплыя пажаданні кубінскаму лідару Раулю Кастра. Магчыма, у хуткім часе Аляксандр Лукашэнка наведае Гавану.

— Я думаю, што мне ўдасца ў найбліжэйшы час пабываць на Кубе. У мяне ёсць доўг перад Фідэлем, і я павінен пабываць у яго на магіле. А вы павінны заўсёды ведаць: калі Беларусь нешта можа зрабіць для Кубы, мы заўсёды адкрытыя і гатовы гэта зрабіць, — запэўніў беларускі лідар.

Падчас размовы было агучана, што хоць беларуска-кубінскія адносіны маюць грунтоўную гісторыю і наладжаны ў розных сферах, патэнцыял, тым не менш, у нас вялікі. І ў плане сацыяльна-эканамічнага развіцця Кубы — тут Беларусь гатова падзяліцца сваім вопытам. І ў плане выхаду на рынкі трэціх краін — для нас Куба — гэта дзверы ў Лацінскую Амерыку і рэгіён Карыбскага басейна, для Кубы Беларусь — вароты ў Еўропу, Еўразійскі эканамічны саюз. Безумоўную цікавасць для абодвух бакоў уяўляюць фармацэўтыка і прамысловая кааперацыя. Напрыклад, МАЗ прапрацоўвае магчымасць заключэння рамачнага кантракта на пастаўку тэхнікі на Кубу на суму ў 100 мільёнаў еўра.

Кантакты з Кубай завязаны больш чым трывалыя, адбываецца рэгулярны абмен візітамі на розных узроўнях. Вось і цяпер літаральна праз некалькі дзён прадстаўнічая беларуская дэлегацыя накіруецца ў гэту краіну для ўдзелу ў Міжнародным гаванскім кірмашы. Сёлета там будзе працаваць і беларускі павільён.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

**Херарда Суарэс Альварэс, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь:**

— Нашы адносіны — не на пачатковым этапе, ім ужо 25 гадоў. Можна сказаць, што яны ў «спелым» этапе. Мы інтэнсіўна працавалі. Намі была створана канцэптуальная, юрыдычная і кантрактная база для іх далейшага развіцця. За апошнія гады тавараабарот падвоіўся і стабілізаваўся. Пры гэтым мы прызнаём, што маецца яшчэ вялікі патэнцыял для развіцця гэтага супрацоўніцтва.

## РАСКАЗАЦЬ ПРА ТОЕ, ШТО ХВАЛЮЕ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі па ўсёй Беларусі пройдуць у гэтую суботу, 21 кастрычніка. На сувязь з насельніцтвам выйдуць кіраўнікі ў рэгіёнах і Мінгарвыканкаме. Вынік такога дыялогу — аператыўнае вырашэнне надзённых пытанняў, зрэшты, ад суботы да суботы колькасць праблемных званкоў скарачаецца.**

Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама ТОКАР Мікалай Васілевіч. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама ПЕНІН Уладзімір Пятровіч. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч. Тэл. 8023 275 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама ПАПОЎ Ігар Андрэевіч. Тэл. 8015 273 56 44;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама ГУРЫНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч. Тэл. 8022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама КРЭПАК Аляксандр Пятровіч. Тэл. 8017 222 44 44.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КНДР паабяцала ЗША «нечуваны ўдар» з-за вучэнняў паблізу яе граніц

Злучаныя Штаты павінны быць гатовыя да таго, што сутыкнуцца з «нечуваным ударам» у «нечаканы момант». Пра гэта гаворыцца ў заяве Пхеньяна з нагоды распачатых на гэтым тыдні сумесных ваенных вучэнняў ЗША і Паўднёвай Карэі каля берагоў Карэйскага паўвострава, якую апублікавала паўночнакарэйскае агенцтва ЦТАК.

«Цяпер, калі ворагі сцвярджаюць, што вучэнні стануць дэманстрацыяй рэальнага ўдару па КНДР, яны павінны ведаць, што самыя жорсткія контрмеры ў карэйскім стылі цалкам гатовы да таго, каб развеяць цэлі як дым толькі адным ударам», — сказана ў заяве.

«Што яшчэ горш, ЗША прыцягнулі проста пад наш нос цэлі, якія мы вызначылі як галоўныя. ЗША павінны ведаць, што сутыкнуцца з нечуваным ударам у нечаканы момант», — падкрэсліваецца ў заяве.

Ваенныя манеўры ЗША і Паўднёвай Карэі стартавалі ў панядзелак, 16 кастрычніка, каля берагоў Карэйскага паўвострава на фоне ўзрастання напружанасці паміж гэтымі краінамі і КНДР. У вучэннях удзельнічае, у прыватнасці, ударная карабельная групоўка, якую ўзначальвае авіяносец «Рональд Рэйган», у склад яе ўваходзяць два эсмінцы — «Стэтэм» і «Масцін».

### Кіраўнік Еўрапарламента заявіў, што Еўропа не прыме незалежнасць Каталоніі



Паводле слоў Антоніа Таяні, каталонскі крызіс з'яўляецца ўнутранай справай Пірэнейскага каралеўства. «Еўропа выступае за дыялог, — дадаў кіраўнік ЕП. — Важна шукаць вырашэнне праблемы ў рамках іспанскай прававой базы і канстытуцыі». «Было б добра, калі б урад Каталоніі не абвяшчаў незалежнасць, таму што ніхто ў Еўропе не можа пагадзіцца з незалежнасцю Каталоніі», — адзначыў Таяні.

Тым часам кіраўнік аўтаноміі Карлес Пучдэмон накіраваў у чацвер ліст прэм'ер-міністру Іспаніі Марыяну Рахою, у якім прыгразіў арганізаваць галасаванне ў парламенце рэгіёна па пытанні абвяшчэння незалежнасці, калі Мадрыд не пагодзіцца на дыялог. Урад каралеўства ў адказ на гэта заявіў, што пачынае працэдуру запуску 155-га артыкула канстытуцыі, які дазваляе абмежаваць самакіраванне Каталоніі.

Нагадаем, што 1 кастрычніка ў рэгіёне прайшло галасаванне па пытанні аб выхадзе Каталоніі са складу каралеўства. У ім узялі ўдзел 2,28 млн з 5,31 млн каталонцаў, якія маюць права голасу, пры гэтым 90,18% удзельнікаў плебісцыту выказаліся за незалежнасць. Мадрыд лічыць гэты рэферэндум нелегітымным і адмаўляецца прызнаваць яго вынікі.

### Большасць расіян негатыўна ставіцца да Сабчак



Як паведаміў Усерасійскі цэнтр вывучэння грамадскай думкі (УЦВГД), 95% рэспандэнтаў добра ведаюць ці нешта чулі пра тэлевядучую Ксенію Сабчак, якая ўчора заявіла пра свае прэзідэнцкія амбіцыі, але 60% апытаных хутчэй адмоўна ставіцца да яе.

Цэнтр падаў даныя апытанняў аб тым, наколькі грамадзяне краіны ведаюць і як ацэньваюць Ксенію Сабчак. Паводле апытанняў 2015 года, 72% рэспандэнтаў добра ведаюць яе, яшчэ 23% што-небудзь чулі пра тэлевядучую. Пазнавальнасць Сабчак расце: у 2012 годзе ўсяго 57% добра ведалі яе. Нягледзячы на папулярнасць, журналістка выклікае ў першую чаргу негатыўныя эмоцыі ў рэспандэнтаў: 60% ставяцца да яе хутчэй адмоўна і ўсяго 21% хутчэй станоўча (прапорцыя не вельмі змянялася з 2012 года).

Аб планах вылучэння сваёй кандыдатуры Сабчак паведаміла 18 кастрычніка ў лісце, адрасаваным у газету «Ведомости». «Ксенія Сабчак у вашым бюлетэні — гэта ёсць графа «супраць усіх», — тлумачыць яна свой крок.

## Армія

# ЭКСКЛЮЗІЎНАЯ АДКРЫТАСЦЬ

### Кіраўнікі вядучых СМІ краіны пafлятали на ваенных верталётах, пастралялі з аўтамата Калашнікава і пакаштавалі стравы армейскай кухні

**На семінар з кіраўнікамі рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі, які не першы год праводзіцца міністрам абароны, гэтым разам прадстаўнікі масмедыя ляцелі на верталётах. І не таму, што ваенны гарадок Заслонава, дзе дыслакуецца 19-я гвардзейская асобная механізаваная брыгада, недаступны для аматараў аўтатранспарту або знаходзіцца далёка ад сталіцы. Журналісцкая супольнасць атрымала ўнікальную магчымасць як мага бліжэй пазнаёміцца з новымі верталётамі Мі-8 МТВ-5, якія ў мінулым снежні паступілі на ўзбраенне беларускай арміі.**



Міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй **РАЎКОЎ** звярнуў увагу на тое, што сустрэча праходзіць у вельмі няпростай інфармацыйнай абстаноўцы. Перш чым пачаць семінар, кіраўнік ваеннага ведамства выказаў глыбокія спачуванні сям'і загінулага ў Печах салдата тэрміновай службы Аляксандра Коржыча і паабяцаў, што ўсе вінаватыя, а таксама тыя, хто сваімі бяздзеяннем і абыякавасцю прывёў да такой сітуацыі, абавязкова панясуць пакаранне.

Акрамя таго, міністр абароны заклікаў бацькоў звярнуць увагу на выхаванне дзяцей. «Не толькі для арміі: у арміі мы робім усё дзеля гэтага, — удакладніў ён. — Як адносіцца старэйшы да малодшага, моцны да слабага — гэта важна. Калі вас нешта хвалюе, звярніцеся да камандзіра часці, у якой служыць ваш сын: камандзір абавязаны прыняць рашэнне, інакш не будзе займаць гэтую пасаду — я гэта гарантую. Калі не давяраеце камандзіру, ёсць іншыя славыя структуры. Штомесяц вядзе прыёмы міністр абароны, у тым ліку ў раёнах, абласцях: нішто не перашкаджае прыйсці і расказаць мне пра сваю праблему. Толькі сумеснымі намаганнямі мы можам змяніць сітуацыю».

У выніку адбыўся адкрыты дыялог міністра абароны з кіраўнікамі айчынных СМІ. Затым кіраўнік ваеннага ведамства асабіста пазнаёміў удзельнікаў семінара з вайсковай часцю. Здавалася, больш чым ён пра славутую 19-ю брыгаду (раней дывізію) не ведае ніхто. І гэта не дзіва: тут, у Заслонаве, прайшлі 11 гадоў службы Андрэя Раўкова.

Наша знаёмства са злучэннем пачалося з розыгрышу эпізоду тактычных заняткаў. Амаль рэалістычныя дзеянні мотастралковага ўзвода на блокпасту і захоп умоўных ваеннапалонных разведвальнай групай яшчэ раз прадэманстравалі баяздольнасць нашай арміі. Вайскоўцы ў любую хвіліну гатовы выканаць пастаўленую задачу, а дапамагаюць ім у гэтым сучасная ваенная тэхніка і ўзбраенне, з асноўнымі ўзорамі якой можна было дэталёва азнаёміцца.

Прадстаўнікі масмедыя на свае вочы ўбачылі, у якіх умовах жывуць байцы, якім чынам адбываецца іх медыцынскае забеспячэнне, а чым, у рэшце рэшт, харчуюцца абаронцы Айчыны, нават удалося прадэгуставаць. Удзельнікі семінара ўбачылі і ўсе сучасныя, а таксама перспектыўныя ўзоры ваеннага адзення. А з некаторымі відамі стралковай зброі кіраўнікі СМІ знаёміліся падчас практычных стрэльбаў, у якіх яны непасрэдна прымалі ўдзел.



Паказальныя выступленні.

Фота БЕЛТА.

Намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Іван ЭЙСМАНТ кожны год удзельнічае ў падобных семінарах. «Па-першае, як любога мужчыну, мяне цікавіць армейская тэма, — прызнаўся ён. — Па-другое, з вопытам разумееш, што роля арміі ў дзяржаве вельмі высокая. Што бывае, калі арміі няма, мы бачым на прыкладзе суседніх і іншых краін. Падчас такіх мерапрыемстваў можна сваімі вачамі ўбачыць, як развіваецца беларуская армія».

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

# Да навуковага ўзроўню

## Работа ЖКГ удасканаліцца і пашырыцца

**У Беларусі створаны праект канцэпцыі ўдасканалення і развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі да 2025 года і прынята рашэнне аб мэтазгоднасці стварэння інстытута па пытаннях камунальнай гаспадаркі пры Акадэміі навук. Пра гэта на адкрыцці рэспубліканскага семінара па ўдасканаленні сістэмы ЖКГ расказаў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль КАЛІНІН.**

### На ўсю краіну

— Пераўтварэнні ў ЖКГ павінны адбывацца ўзважана. Усе грамадзяне з'яўляюцца спажыўцамі жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) і прынцыпова ацэньваюць любыя змены ў гэтай сферы. Таму галоўная задача ў рабоце з насельніцтвам — забяспечыць належную якасць паслуг, празрыстасць і абгрунтаванасць фарміравання іх кошту. Для дадатковага вывучэння прапаноў насельніцтва ў Мінжылкамгасе з 18 па 21 кастрычніка працуе прамая тэлефонная лінія. Усе прапановы будуць прыняты ўрадам на кантроль, — падкрэсліў намеснік прэм'ера.

Ён звярнуў увагу, што семінар мае на мэце вызначыць асноўныя кірункі ўдасканалення і развіцця ЖКГ на перспектыву. У прыватнасці, з прынятым канцэпцыі будзе адкарэктавана існуючая дзяржпраграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады і падрыхтавана новая дзяржпраграма на наступную пяцігодку.

— Мы хочам паказаць самае лепшае, што ёсць у ЖКГ, што працуе і даказала сваю эфектыўнасць і можа быць зроблена на ўсіх рэгіёнах. Рэалізаваны сучасныя сродкі камунікацыі з насельніцтвам, наладжана работа з цвёрдымі камунальнымі адходамі, арганізавана сістэма аўтаматызацыі і дыспетчарызацыі, — агучыў задачы семінара і дасягненні ў галіне ЖКГ **міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Аляксандр ЦЕРАХАЎ**. — Мы маем рэзервы да зніжэння затрат. Пры планавай мадэрнізацыі і наяўнасці інвестыцый можна дасягнуць яшчэ большых вынікаў: зменшыць расход электраэнергіі, знізіць сабекошт цеплавой энергіі, перавесці сучасныя камунальныя на мясцовыя віды паліва. Гэта элементы, якія неабходна ўкараняць у сістэму па ўсёй краіне.

### Перавагі службы 115

Падчас семінара прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў з іншымі ўдзельнікамі мерапрыемства пабываў у Цэнтры інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама і азнаёміўся з работай адзінай дыспетчарскай службы 115 і функцыянаваннем партала «Мой горад» 115.бел.

— У службы 115 наладжана аўтаматызаваная сувязь з Мінскводаканалам — заяўкі туды трапляюць наўпрост, з Мінскэнерга падпісана пагадненне, але пакуль сістэма не аўтаматызавана да рэжыму рэальнага часу, — расказаў **Алег СЯДЗЕЛЬНІК, дырэктар Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама.** — Яны нас інфармуюць пра сваю работу, каб мы маглі аператыўна паведамляць пра гэта грамадзянам. Асабліва важна, каб службы інфармавалі нас аб планавых адключэннях ці аварыйных работах.

— Служба 115 — адзіная кропка камунікацыі з насельніцтвам, якую можна рэалізаваць у любым кутку Беларусі з прывязкай да мясцовасці, — падкрэсліў міністр ЖКГ. — Унікальнасць яе ў тым, што ніводная заяўка не застаецца без увагі. Калі некаторыя таварыствы ўласнікаў (ТУ) адмаўляюцца ад аварыйнага абслугоўвання, праз гэта церпяць самі ўласнікі. Немагчыма знайсці старшыню таварыства, калі аварыя здараецца ноччу, таму мінімальны набор паслуг па аварыйным рэагаванні абавязкова павінен аказвацца, нягледзячы на жаданне старшыні ТУ.

Партал «Мой горад» 115.бел працуе ў сталіцы і Віцебску, наладжаны кантакты па стварэнні сістэмы ў Брэсце і Гродне. За 2018-ы запланавана абавязковая падключыць да партала ўсе гарады з насельніцтвам ад 100 тысяч чалавек, а астатнія будуць далучацца па меры гатоўнасці, паведаміў Анатоль Калінін.

### Машына-амфібія і вакуумны экскаватар

Спецыялізаваную тэхніку і яе магчымасці анансаваў удзельнікам семінара **дырэктар Мінскводаканала Алег АЎРУЦІН**.

Машына-амфібія можа касіць траву, чысціць вадаёмы ад водарасцяў, працаваць на мелкаводдзі, рабіць невялікія лакальныя раскопкі, прарэджваць чарот і іншае.

— Два дызель-генератары магутнасцю 200 кВт мы набылі пасля некалькіх аварыйных адключэнняў электраэнергіі. Адным генератарам можна сілкаваць усе павышальныя помпавыя станцыі ў горадзе і лакальныя, каналізацыйныя, ачышчальныя. Праз 30 хвілін такі генератар можна падключыць да любой помпавай станцыі, — расказаў ён.

Лакальную павышальную помпавую станцыю спецыялісты прадпрыемства распрацавалі і сабралі самі. Ёю мяркуецца карыстацца, калі здарыцца аварыя на знешняй водаправоднай сетцы або прападзе электрычнасць. Такая тэхніка жыццёва неабходная, калі гэта здараецца на такіх крытычных аб'ектах, як бальніцы з рэанімацыяй.

— Устаноўка прыязджае да бальніцы, да яе дастаўляюць ёмістасць з вадой, усё падключаецца, і любы аб'ект мы можам паставіць пад ціск за некалькі хвілін. 1-я і 6-я бальніцы і бальніца хуткай медыцынскай дапамогі ўжо абсталяваны злучэннямі да гэтай устаноўкі, — паведаміў дырэктар. — Плануем, што на наступны год усе бальніцы будуць адаптаваны пад гэтую ўстаноўку.

Вакуумны экскаватар незаменны для аператыўных раскопак у месцах з вялікай колькасцю камунікацый. Простымі словамі, гэта вялікі прамысловы пыласос, які можа капаць на глыбіню да 40 метраў, не пашкоджваючы пракладзеныя сеткі. Да таго ж экскаватар можа працаваць з вільготным грунтам. Цяпер гэтая машына працуе амаль у кругласутачным рэжыме.

Аб удасканаленні работы з камунальнымі адходамі ўдзельнікам семінара расказалі на смецеперапрацоўчым сартавальным заводзе непадалёк ад палігона «Трасцянецкі», а функцыянаванне цеплавой гаспадаркі яны пабачылі на кацельнай у Бараўлянах.

Сёння семінар працягне сваю работу — з удзелам кіраўніка дзяржавы.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

---

## ■ Надвор'е

# Уначы ўжо з мінусам

**Пасля анамальна цёплай другой дэкады кастрычніка сёння да нас завітае традыцыйны восеньскі холад**

**А сур'ёзнае пахаладанне чакаецца ў нашай краіне ўжо ў выхадныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу максімальная тэмпература складзе да плюс 15 градусаў. У выхадныя чакаецца далейшае паніжэнне тэмпературнага рэжыму. У паўночна-ўсходніх раёнах тэмпература паветра ўначы апусціцца ніжэй за нуль. Але такое надвор'е цалкам адпавядае календару. У суботу і нядзелю ў нас будзе гаспадарыць надвор'е, сфарміраванае пад уплывам халоднага антыцыклону, шлях якога пройдзе са Скандынавіі на цэнтральныя раёны Расіі. Але ў заходніх раёнах Беларусі будзе цяплей.

У суботу ўначы ў некаторых раёнах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, а ўдзень пераважна па паўднёвым захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Праўда, на астатняй тэрыторыі краіны будзе ў асноўным без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — 4—10 цяпла. Аднак па паўднёвым захадзе будзе цяплей, калі чакаецца ўначы 5—9 цяпла, а ўдзень — ад плюс 11 да плюс 13 градусаў. Уначы ў нядзелю ў некаторых раёнах па паўднёвым захадзе, а ўдзень месцамі па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай прагназуецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 4—10 цяпла. У паўднёва-заходніх раёнах уначы будзе 4—7 цяпла, а ўдзень — ад плюс 11 да плюс 13 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак пад уплывам франтальнай сістэмы, якая перамяшчаецца з тэрыторыі Польшчы, пераважна па паўднёвым захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 цяпла, па паўночным усходзе пры праясненнях папізіцца да нуля — мінус 4 градусаў. Удзень будзе 3—9 цяпла, а ў паўднёва-заходніх раёнах прыгрэе да плюс 12 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

---

## ■ Відавочца

# УСКРЫК... У ВАЧАХ ПАСАЖЫРАЎ — ЖАХ

**Учора ранкам у сталічным метрапалітэне на станцыі «Кастрычніцкая» на рэйкі ўпаў чалавек.**

...Поезд, замаруджваючы рух, паспеў праехаць больш за палову даўжыні платформы, і я разам з іншымі пасажырамі ўжо зрабіў крок бліжэй да яе краю, калі пабач, недзе за пяць-сем метраў, нечакана пачуўся гучны жаночы ўскрык. Састаў спыніўся вельмі хутка. Самога моманту падзення не бачыў, толькі рэакцыю навакольных, пераважна жанчын. Яны літаральна адхлынулі ў процілеглы бок, закрываючы раты далонямі. У вачах — жах. Жанчына, якая, мабыць, усё бачыла, заплакала. Ад навакольных пачулася, што пад састаў скочыла дзяўчына... Поезд на процілеглым баку платформы застыў на месцы з расчыненымі дзвярамі. У саставе, які спыніўся, не даехаўшы да канца платформы, іх уручную пачаў адкрываць машыніст, выпускаючы пасажыраў.

На абясточаныя пуці спусціліся работнікі станцыі, з'явілася міліцыя. Калія кабіны поезда сабраўся натоўп, некаторыя здымалі на мабільныя. Высокі кітаец трымаў прыладу над галавой... Учадзеныя ці ўпяцярых пацярпелую падкялі на платформу і за рукі-ногі перанеслі на процілеглы бок, паклаўшы на лаўку. На целасклада было бачна, што гэта дарослая жанчына...

Многія пасажыры адразу пасля здарэння накіраваліся да эскалатараў, але многія заставаліся на платформе, стаялі на лесвіцы і ўпачатку пераходу ў бок «Купалаўскай». Нарэшце прагучала аб'ява, што станцыя закрываецца, просьба яе пакінуць. Людзі пакрысе пацягнуліся да эскалатараў. Я не паспеў дайсці да таго, што ў бок Дома афіцэраў, як зноў прагучала: рух адноўлены. Першым рушыў састаў у бок чыгуначнага вакзала, праз колькі секундаў падышоў поезд і з іншага боку платформы...

Неўзабаве прадстаўнікі метрапалітэна агучылі наступную інфармацыю: пацярпелай 37 гадоў, яна жывая, медыкі аказваюць жанчыне патрэбную дапамогу. Рух паяздоў на першай лініі быў адноўлены праз пяць хвілін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

---


БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

## ОАО «БНБ-БАНК»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2017 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2017 | 01.01.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 9 653 | 21 531 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | – | – |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 33 088 | 18 352 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 50 286 | 15 657 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 96 116 | 62 610 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 293 644 | 258 766 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 224 | 274 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 80 | 80 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 20 147 | 19 258 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 3 925 | 1 070 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | – | – |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 7 426 | 7 022 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 514 589 | 404 620 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | – | – |
| 17 | Средства банков | 1202 | 80 606 | 84 768 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 348 818 | 247 591 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 23 522 | 17 829 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | – | – |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | – | – |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 2 314 | 1 464 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 455 260 | 351 652 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 11 075 | 11 075 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 6 400 | 6 400 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 9 726 | 9 835 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 32 128 | 25 658 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 59 329 | 52 968 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 514 589 | 404 620 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2017 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2017 | 01.10.2016 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 29 387 | 31 118 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 14 621 | 15 055 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 14 766 | 16 063 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 7 281 | 6 588 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 2 402 | 1 846 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 4 879 | 4 742 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | – | – |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (65) | – |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 6 808 | 8 885 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (414) | (3 375) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 2 702 | 8 606 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 2 007 | 1 290 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 15 731 | 12 613 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 963 | 814 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 8 585 | 5 572 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 156 | 1 311 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 7 429 | 4 261 |

Генеральный директор К. Церетели

Главный бухгалтер Н. П. Шнип

Дата подписания: 12 октября 2017 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
**http://www.bnb.by/o-banke/finansovye-pokazateli/finansovaya-otchetnost/otchet-o-pribyli-i-ubytkakh.html**

**Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»**
Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, №10 от 7 июня 2013 г.
УНП 100513485.



**Внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест №3» состоится 31 октября 2017 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 27 октября 2017 г.

**Повестка дня собрания:**

О выплате дивидендов за 9 месяцев 2017 года.

Собрание будет проводиться в очной форме.

Голосование на собрании будет осуществляться бюллетенями для голосования.

Документы, подлежащие предоставлению лицам, имеющим право на участие в собрании акционеров:

проект решения по вопросу повестки дня собрания.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с документами с 27 октября 2017 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 31 октября 2017 года с 10.00 по 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

УНП 700049607

# «Наша адзенне — душа народная»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адзін з гасцей форуму, **дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту Эдуард БАГДАНОВІЧ**, адзначыў: «У народзе кажуць — чалавека сустракаюць па адзенні. Што ж такое беларускі касцюм? Наша адзенне — гэта душа народная, нашы традыцыі і наша Бацькаўшчына. Таму пакуль мы будзем помніць свой традыцыйны касцюм, вывучаць і перадаваць маладому пакаленню, будзе жыць і квітнець наша цудоўная краіна».



— Форум праводзіцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, — падкрэсліў **доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар, акадэмік НАН Беларусі Аляксандр ЛАКОТКА** на ўрачыстым адкрыцці міжнароднага кангрэса. — Тут захоўваюцца не толькі найбуйнейшыя ў нашай краіне калекцыі традыцыйнага касцюма і народных тканін, іканапісу, скульптуры, помнікаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і этнаграфіі, але і праводзяцца значныя па сваіх выніках даследаванні, накіраваныя на захаванне і выкарыстанне ў сучасным жыцці краіны шматвекавых традыцый матэрыяльнай культуры, здабыткаў народнага і прафесійнага мастацтва. Наш форум дае выдатную магчымасць абмеркаваць важныя пытанні гісторыка-культурнай спадчыны, засяродзіць увагу на шырокім коле пытанняў, акрэсленых нацыянальным гістарычным касцюмам, яго сучасным бытаваннем. Беражліва і ўважліва вывучаючы мінулае, звяртаючыся да народнага вопыту нашых продкаў, мы зможам лепш разумець уласнае і будучае нашай квітнеючай радзімы.

На пленарным пасяджэнні выступалі не толькі айчынныя спецыялісты, як, напрыклад, старшы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускай культуры Марыя Віннікава, але і замежныя госці. Так, Аляксандр Новік з Музея антрапалогіі і этнаграфіі Расійскай акадэміі навук расказаў, што ў іх фондах захоўваецца багатая калекцыя беларусістыкі. У сілу некаторых гістарычных абставін (рэпрэсій навукоўцаў) яна так і не была апісана належным чынам. Таму Новік звярнуўся да беларускіх спецыялістаў з просьбай дапамагчы апісаць і сістэматызаваць калекцыі беларускіх прадметаў у расійскім музеі. Рээт Пійры з Эстоніі падзялілася вопытам стварэння сучаснай экспазіцыі народных касцюмаў. Яна расказала, што ў 2016 годзе ў іх адкрыўся новы Нацыянальны музей. І важнае месца ў ім занялі традыцыйныя эстонскія касцюмы. Для калекцый адмыслова выраблялiся манекены — яны ствараліся па мерках, знятых з адзення. Для стварэння дынамічных манекенаў спецыяльна пазіравалі добраахвотнікі, якія маюць адпаведны памер.

— Мы сустрэліся, каб пазнаёміць усіх з культурнымі дасягненнямі нашай краіны. Гэты кангрэс — унікальны праект, — рэзюмаваў **акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр КАВАЛЕНЯ**. — Безумоўна, пашырэнне кантактаў у сферы аховы і выкарыстання культурнай спадчыны будзе садзейнічаць вывучэнню сусветнага вопыту і найноўшых дасягненняў у гэтай галіне. На міжнародным навуковым форуме не толькі адбыліся навукова-практычныя канферэнцыі, але і працавалі выставы. Тут можна было пазнаёміцца з выставай традыцыйнага беларускага касцюма — з музейнага збору аддзела старажытнабеларускай культуры — і выстаў галаўных убораў, якая з'яўляецца сумесным праектам аддзела старажытнабеларускай культуры і музея народнай архітэктуры і побыту.

У Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі можна ўбачыць некалькі выстаў — традыцыйнага беларускага касцюма, а таксама галаўных убораў. Спецыяльна для гасцей кангрэса рэспубліканскае навукова-вытворчае прадпрыемства беларускіх народных рамёстваў «Скарбніца» прадэманстравала сучасную калекцыю традыцыйнага касцюма, выкананую па падставе навуковых рэканструкцый яго страчаных ці малавядомых лакальных варыянтаў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*



Фота Кастуся ДРОБАВА.

## СПАЛУЧЫЦЬ НАДЗЁННАЕ З ВЕЧНЫМ

У Мінскай духоўнай семінарыі адбылася міжнародная канферэнцыя

**У духоўнай сталіцы Беларускай праваслаўнай царквы — Жыровіцах, — адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Дзяржава, грамадства, Царква ў гісторыі Беларусі». Яе арганізатары — Нацыянальная акадэмія навук, БПЦ, Мінскія духоўныя акадэмія і семінарыя — прысвяцілі падзею 500-годдзю выдання Францыскам Скарынам друкаванай Бібліі і 300-годдзю з дня нараджэння свяціцеля Георгія Каніскага, архіепіскапа Магілёўскага.**

Падчас адкрыцця канферэнцыі **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі, кандыдат багаслоўя**, звярнуў увагу на адносіны паміж Царквой і дзяржавай. Па яго словах, зараз шмат кажуць пра шчыльнае спалучэнне паміж імі, але яно, па сутнасці, немагчымае. Бо ў чалавека, які адносіць сябе да Царквы, задача — падрыхтавацца да вечнага жыцця, імкнуцца да выратавання. А дзяржава скіравана на забеспячэнне дабрабыту грамадзян у жыцці зямным. Таму тут можна казаць толькі пра сумесную работу ў пэўных кірунках, і канферэнцыя, што адбылася, — таму прыклад.

**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума НАН Беларусі, доктар эканамічных навук, акадэмік,** адзначыў, што развіццё друкаванай кнігі і культуры на Беларусі непасрэдна звязана з дзейнасцю хрысціянскіх вернікаў, якія станоўча ўплывалі на гэтую сферу. На сучасным этапе Царква з'яўляецца інстытутам, які нагадвае грамадству пра маральныя каштоўнасці і тым самым выконвае важную функцыю.

Падчас міжнароднай канферэнцыі адбыліся прэзентацыі гістарычных выданняў, а таксама круглыя сталы, прысвечаныя Францыску Скарыну і Георгію Каніскаму.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# Кожнаму — свой утульны куток

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Віталь Сінкевіч, які жыве ў доме-інтэрнаце, згадвае, як на яго нядаўні дзень нараджэння завіталі члены брацтва. «Прыехалі дзяўчаты, падарылі каробку цукерак і новыя красоўкі», — дзеліцца Віталь. Увогуле валанцёры брацтва ўжо амаль дзесяцігоддзе наведваюць тых, хто жыве ў Нясвіжскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў. Дапамагаюць яны не толькі ў побытавым плане, але і гутараць, выконваюць невялікія, але важныя для людзей просьбы: прывезці прысмакі, матэрыялы для творчасці, а таксама ладзяць канцэрты, якія тут з задавальненем глядзяць.



**Ва ўрачыстым адкрыцці аддзялення ўзялі ўдзел старшыня Нясвіжскага райвыканкама Іван КРУПКО, дырэктар дома-інтэрната Генадзь МАЛЯР і настаяцель праваслаўнай Свята-Троіцкай царквы аг. Салтанаўшчына Алег АБРАМОВІЧ** *(злева направа).*

Валанцёры шмат што робяць за ўласныя сродкі і сваімі сіламі. Напрыклад, Ала Жураўская — маці трох уласных дзяцей і дваіх прыёмных — працавала закройшчыцай, перанесла шэраг складаных аперацый і цяпер сама мае інваліднасць. Але гэта не перашкаджае ёй ужо дзесяцігоддзе ахвяраваць вольным часам і сіламі дзеля таго, каб дапамагчы іншым. Увогуле, брацтва Праабражэння самае буйное ў епархіі і адно з самых актыўных: штогод тут праводзяцца летнія, восеньскія і зімовыя злёты-лагеры, мерапрыемствы, звязаныя з выхаваннем, рэабілітацыяй, аздараўленнем і арганізацыяй вольнага часу моладзі і інвалідаў.

«У доме-інтэрнаце добрыя ўмовы, — кажа айцец Алег Абрамовіч. — У жыццёва важных сферах людзі патрэбы, як правіла, не маюць. А менавіта ў такіх дробных просьбах, як пакласці грошы на тэлефон ці прывезці слоік любімага варэння, у тым, што нашы валанцёры ўжо не першы год сюды прыязджаюць, сябруюць з тымі, хто тут жыве, і выкрываецца сэнс нашай работы. Мы цесна супрацоўнічаем з установай, таму ў снежні мінулага года падпісалі дагавор аб узаемным супрацоўніцтве паміж Праабражэнскім брацтвам і Нясвіжскім домам-інтэрнатам. А калісьці ў гутарцы з дырэктарам з'явілася ідэя стварыць маладзёжны цэнтр, якую з цягам часу мы і ажыццявілі».

Генадзь Маляр, які 28 гадоў з'яўляецца дырэктарам дома-інтэрната, вядзе нас па свежаадрамантаванай прыбудове, разлічанай на 27 ложка-месцаў. Пакоі на два чалавекі ў асноўным размешчаны ў блоках, на кожны — асобныя душ і прыбіральня. Прыгожыя шпалеры, прыемная па колеры плітка, новыя ложкі, сучаснае абсталяванне — не ў кожнай кватэры сустрэнеш такі рамонт. Тут жа — асобная кухня, на якой можна як харчавацца самастойна, так і есці прыгатаваную супрацоўнікамі ежу. А для тых, хто вырашыць наведаць блізкіх, што жывуць у доме-інтэрнаце, ёсць асобны пакой з усімі выгодамі, каб застацца на ноч ці больш. Прытым для таго каб маладыя людзі змаглі бавіць час разам, зрабілі асобнае памяшканне для гутарак і чаявання, камп'ютарны клас, кабінет ЛФК.

«Для нас гэта аддзяленне — сапраўдная радасць, — дзеліцца сваімі ўражаннямі Канстанцін і Алена, якія жывуць у доме-інтэрнаце. — Мы вельмі рады, што хутка пераедзем у новы дом, дзе будзем жыць разам са сваімі сябрамі і спадзяёмся сустрэць новых».

Да гэтага моманту маладыя інваліды былі размеркаваны па іншых аддзяленнях інтэрната і пражывалі разам з састарэлымі. Цяпер для маладых, якіх тут каля дзесяці, будзе асобнае памяшканне. «Кожнаму — свой куток. Як дома», — кажа Генадзь Маляр.

Грошы на стварэнне аддзялення збіралі ўсёй грамадой: дапамога паступіла з бюджэту Мінаблвыканкама і прадпрыемстваў раёна, а таксама ад брацтва Праабражэння.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



Пасля змены іміджу вядучай пачалі рабіць кампліменты нават жанчыны.

## Святлана ПАНКРАТАВА:

# «НАДВОР'Е БУДЗЕ!»

**Надвор'е лічыцца адной з нейтральных і, паводле правілаў этыкету, найбольш удалых тэм для размовы нават для незнаёмых людзей. Аднак этыкет этыкетам, а гаварыць пра надвор'е не адзін год і пры гэтым заставацца актуальным, цікавым і папулярным тэлевядучым — лічы, найвышэйшы пілатаж. Святлана Панкратава, якая вядзе нядзельныя «Навіны надвор'я», а таксама штодзённую рубрыку «Пра надвор'е» ў «Панараме», так можа, умее, практыкуе. Каб даведацца пра сакрэты яе метэаўстойлівасці і фірменнай спакойнай усмешкі, мы напрасіліся да вядучай на інтэрв'ю.**

Пачалі з круглай даты: з 1997 года Святлана вядзе праграму «Навіны надвор'я». 20 гадоў у тэме — уражальны паказчык, але, з іншага боку, за такі тэрмін нават самая любімая тэма можа набіць аскому. Як удаецца пазбягаць прафесійнага выгарання?

— Ведаеце, калі сёлета атрымлівала «Тэлевяршыню» (як найлепшая вядучая тэматычнай праграмы. — **Аўт.**), я зусім шчыра прызналася, што мне вельмі пашанцавала па жыцці трапіць у такую тэму, — успамінае вядучая. — Бо надвор'е — тое, пра што можна гаварыць штодня па-рознаму, кожны раз звяртаючы ўвагу на дэталі: ці то летам прыходзіць скандынаўскі антыцыклон, ці то чакаецца моцны вецер або трымаецца незвычайная для нейкага сезона тэмпература. Вельмі шмат і тэм «вакол надвор'я»: замена шын на аўто, уплыў атмасфернага ціску на людзей, жывёл і расліны, прыродныя анамаліі ў іншых краінах свету... Словам, надвор'е — тэма бясконцая і багатая, і набіць аскому яна ніяк не можа, прынамсі мне. Да таго ж я перыядычна сыходзіла ў дэкрэт і паспявала як след засумаваць па працы. Таму мне не сумна. Калі было б нецікава, ужо шукала б нешта іншае — альбо яно само мяне б знайшло. А так мы з прагнозам надвор'я знайшлі адно аднаго *(смяецца)*.

## Знак пастаянства

**— Акрамя метэапраграм у вашым прафесійным багажы акцёрская і рэжысёрская адукацыі, удзел у літаратурных праграмах, тэлеспектаклях, рэкламе. Ці не хочацца часам вярнуцца да нейкага з гэтых кірункаў?**

— Усё можна сумяшчаць з асноўнай працай, але каб займацца толькі гэтым — не. Тэлеспектаклі здымаюцца не кожны дзень, у рэкламе можна доўга не патрапляць, а тэатральная сцэна — справа надзвычай складаная, дый наогул гэта не маё. Калі толькі трапіла на тэлебачанне, я зразумела, наколькі тут адрозная акцёрская спецыфіка, успрыманне аўдыторыі ў параўнанні з тэатрам. У тэлестудыі мне не тое што прасцей... Я плыўчыха, люблю ваду. І гэтаксама ўпэўнена пачуваюся ў тэлевізійным асяроддзі.

**— І ўсё ж, калі паразважаць «у космас»... Калі не надвор'е, то што яшчэ магло быць вашай тэмай?**

— Дзеці, — цёпла ўсміхаецца Святлана.

**— Так-так, магчыма, гледачоў чакае аўтарская дзіцячая праграма?**

— Не, я ў тым сэнсе, што напэўна магла б быць хатняй гаспадыняй, або працаваць настаўніцай пачатковых класаў ці выхавальніцай. Так, каб пастаянна штосьці дзецям расказваць. З імі значна цікавей і прасцей наладзіць стасункі, чым з дарослымі, ім нельга, дый не ўзнікае жадання, схлусіць. ...Але што да праграмы — мабыць, не. На беларускім тэлебачанні ёсць тыя, хто робіць добрыя дзіцячыя праекты, таму мне ў такім узросце стаць «групай падседжвання» ўжо нават неяк непрыстойна.

**— «Групай падседжвання»?!**

— Калі я толькі пачынала працаваць на тэлебачанні, тут былі вельмі вопытныя і вядомыя дыктары, якія ўжо даўно працавалі і ведалі нюансы прафесіі. А мы былі дыктары-стажоры, маладая змена, і нас мякка называлі «групай падседжвання». Выраз так спадабаўся, што згадваю яго і цяпер.

**— У сучасным свеце лічыцца ці не правілам добрага тону мяняць працу кожныя некалькі гадоў. А вы як прыйшлі ў Белтэлерадыёкампанію ў 1991-м, так дагэтуль у холдынгу і працуеце, хоць, я ўпэўнена, спакуслівыя прапановы паспрабаваць сябе ў іншым месцы былі. У чым сакрэт вернасці?**

— Прапановы сапраўды былі. Напрыклад, калі я ішла ў дэкрэт і знікала з экранаў, людзі лічылі, што я звольнілася, і тэлефанавалі з рознымі ідэямі. Але каб кудысьці пайсці — як гэта, чаму, дзеля чаго? Я адналюб! Сюды ў свой час было вельмі складана трапіць, я прайшла па конкурсе, адбылася ў прафесіі і цяпер па вялікім рахунку ўсё мяне задавальняе: мяне тут не крыўдзяць, наадварот, любяць... *(усміхаецца)*. Таму кардынальныя змены ў маім выпадку — пэўна, тое лепшае, якое вораг добрага.

## Прыкметы новага часу

**— Ведаю, што ў «Навіны надвор'я» заўжды прыходзілі мяхі лістоў і сотні званкоў ад гледачоў. Ці пішуць сёння — у сацыяльных сетках альбо па старой завядзёнцы на пошту?**

— Ох, памятаю, якія стосы пісьмаў прыходзілі ў рэдакцыю, асабліва калі мы праводзілі літаратурны конкурс альбо давалі заданне напярэдадні Новага года, хто больш дакладна адгадае, якім будзе надвор'е на святы... Перасягнуць сіноптыкаў было столькі ахвотных — прычым многія правільна прадказвалі нават кірунак ветру! — што адбор быў сапраўды вельмі строгі. Толькі найлепшыя з найлепшых атрымлівалі магчымасць трапіць у эфір. Так, успамінаю сярод верных нашых гледачоў Лідзію Сямёнаўну Фарботка з Прудоў, што на Стаўбцоўшчыне. Яна вельмі сябравала з праграмай, дасылала нам у падарунак і саленні, і варэнні і ўвесь час актыўна ўдзельнічала ў конкурсах... (Лідзія Сямёнаўна, дарэчы, добра знаёмая і сталым чытачам «Звязды» як шматгадовая ўдзельніца конкурсаў прыпевак і гумарыстычных вершаванак. — **Аўт.**)

Гады тры ці чатыры гэта традыцыя захоўвалася, потым пакрысе ад конкурсаў мы адышлі. Цяпер засталіся самыя адданыя прыхільнікі, якія хоць і ў меншым аб'ёме, але працягваюць пісаць, прапаноўваць ідэі і тэмы — расказваюць, напрыклад, пра сельскагаспадарчыя прылады, якія прыдумалі самі. Раней хранаметраж і фармат праграмы дазваляў скарыстаць гэта ў эфіры: у нас былі спецыяльныя рубрыкі «Карысныя парады» і агляд лістоў. Сучасны фармат больш сціслы і дынамічны, таму ў асноўным гледачы пакідаюць свае допісы ў сацыяльных сетках. Ці плануем зладзіць там інтэрактыў? Магчыма, чаму б і не. Хоць асабіста я больш люблю сустрэчы ўжывую, а сацыяльнымі сеткамі і інтэрнэт-месенджарамі карыстаюся вымушана, больш у працоўных мэтах.

**— Нягледзячы на тое, што «Навіны надвор'я» — тэлевізійны доўгажыхар, кожны сезон у праграме нешта мянялася: назва, афармленне, месца здымак. А вас гледачы бачылі і дзяўчынкай у яркім паліто, і строгай пані з пучком, і гараджанкай на ўлонні прыроды. Якія перамены былі самымі значнымі?**

— Калі мы перайшлі працаваць у студыю, бо здымкі на прыродзе — з аднаго боку, большая свабода руху (галоўнае, з кадра не выйсці), а з другога, пастаянныя форс-мажоры: то дождж знянацку пойдзе, то вецер мікрафон задзьме, трэба думаць, як гук запісаць. У студыі больш жорсткія патрабаванні: іншае святло, акустыка, патрэбны стрымана-дзелавы стыль адзення і строгі вобраз вядучага. Мне пашчасціла пазнаёміцца з іміджмейкерам Таццянай Канцэравай, якая дапамагла істотна змяніць вобраз і многае падказала, пачынаючы ад «маіх» колераў да падбору мэйкапу і прычоскі. Пры тым што мне было ўжо за сорак, здавалася б, далёка не навічок у кадры, некаторыя рэчы сталі літаральна адкрыццём! На ранейшыя свае вобразы я гляджу з настальгіяй, дзесьці нават з усмешкай, аднак менавіта дзякуючы Таццяне я па-новаму раскрыла жаноцкасць, нават сама сабе стала больш падабацца. Дагэтуль прыслухоўваюся да яе парад і не адыходжу кардынальна ад прыдуманага разам іміджу.



Камандзіроўка ў пасёлак Езярышча — самае халоднае месца ў Беларусі. «Была сярэдзіна зімы, мароз тады стаяў жудасны!» — успамінае Святлана Панкратава.



Фота на памяць разам з пераможцай тэлеконкурсу Лідзіяй Сямёнаўнай Фарботкай.

**— Пры ўсіх пераменах у кадры заставалася не толькі пастаянная вядучая, але і беларуская мова праграмы. Гэта традыцыя або прынцыповы момант?**

— Так, прынцыповы, у чымсьці нават асветніцкі. Калі сёлета мы адкрывалі новую праграму «Пра надвор'е» ў межах «Панарамы», таксама было адназначна, што беларуская мова застаецца. Мову нашу ведаюць усе беларусы — быць можа, не ўсе свабодна размаўляюць і думаюць на ёй, але дакладна ўсе разумеюць.

**— І тое праўда: як па-руску расказваць пра старадаўнія кліматычныя прыметы або беларускі народны каляндар? Дарэчы, сёння народныя прыметы часцей спрацоўваюць ці памыляюцца?**

— Памыляюцца, вядома, пра гэта і сіноптыкі гавораць. Бываюць супадзенні, але збольшага выпадковыя. Тым не менш расказваць пра народны каляндар цікава, нагадваючы людзям, адкуль пайшло тое ці іншае свята і традыцыя. Што да народных прыкмет — і сёння ёсць апантаныя энтузіясты, якія вядуць дзённікі назіранняў за надвор'ем і паступова складаюць новыя прыкметы, актуальныя ўжо для нашага часу.

## Прырода спакою

**— Чалавек, які шмат гадоў ведае знутры кліматычныя тэндэнцыі і прагнозы спецыялістаў, напэўна, можа пахваліцца самым зайздросным дачным ураджаем?**

— Якое там! Я дагэтуль бульбу не выкапала, хоць сама ж, памятаю, казала ў кадры амаль месяц таму: «26 верасня — Карнілій, а пасля Карнілія карані ў зямлі больш не растуць, таму ўся каранёвая агародніна павінна да гэтага часу быць выкапана з зямлі...». Бульбы ў мяне пасаджаны дзве малыя грады, збяром, можа, вядры з два ўраджаю. Вось суседкі мае — так, цягавітыя працаўніцы, яны гэтым жывуць, кормяць свае сем'і і нават мяне частуюць. Так што, калі маё некультурнае пустазелле лезе да іх на акультураныя агароды, робіцца крыху няёмка. Летам, калі мы жывём на дачы, стараюся дагледзець участак — ён невялікі, чатыры соткі, пераважна лужок, агародных пасадак зусім няшмат. Так, я разумею, што прыемна пайсці і сарваць агурок ва ўласным парніку, але папярэдне трэба прыкласці шмат намаганняў: вечарам зачыніць, раніцай адчыніць, пасадкі паліць, падкарміць, шкоднікаў знішчыць, пчолак, калі трэба, запусціць... Карацей, гэту справу трэба любіць і пастаянна ёй займацца, а ў мяне не атрымліваецца. Дый працы шмат, так што на дачы хочацца проста пабыць у цішыні і спакоі.

**— Словам, вы проста назіраеце за прыродай і адпачываеце. А ў горадзе — «дамашняя прырода» ўсё такая ж разнастайная?**

— Доўгі час у нашай сям'і жыў дамашні ўлюбёнец — сабачка Жужа. На жаль, зімой Жужа памерла, і без яе стала так пуста, што мы не вытрымалі, узялі месяц таму джэк-расэл-тэр'ера. Гэта такі сабака з маторчыкам, які ніколі не спыняецца, згустак энергіі і жыццярадаснасці. А наша котка-«шатландка» — наадварот, вельмі спакойная, лянівая — сабака скача на ёй верхам, бы на кані. І яны адно аднаго цудоўна дапаўняюць, а нас усіх заражаюць аптымізмам. Лічу, калі няма алергіі, то ў доме павінна быць жыўнасць. Хоць гэта дадатковая адказнасць, перажыванні, выдаткі, але разам з тым і новыя яркія фарбы ў жыцці і найлепшая прафілактыка нудоты.

## Наўздагон

**Любімы анекдот пра сіноптыкаў ад Святланы Панкратавай: «Паважаныя радыёслухачы! Калі вам спадабаўся прагноз надвор'я, напішыце нам, і мы абавязкова паўторым яго ў наступнай перадачы».**

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

Фота з асабістага архіва вядучай.

# ШАШКІ

**Выпуск №48**

З 25 верасня па 1 кастрычніка ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках (г. Мінск, вул. Маркса, 10) праходзіла першая ліга чэмпіянату Беларусі па шашках-100 сярод мужчын і жанчын. Абодва турніры насілі статус адборачных спаборніцтваў да чэмпіянату краіны па шашках-100 (Найвышэйшая ліга). Спаборніцтва сярод мужчын сабрала 22 удзельнікі, сярод якіх 8 майстроў спорту. Пераможцам выйшаў майстар спорту з Бабруйска Мікалай Кадзеснікаў — 10 ачкоў з 14 магчымых. Яшчэ 6 шашыстаў набралі па 9 ачкоў, каэфіцыент іх расставіў у наступным парадку: майстар Дзмітрый Немец, кандыдат у майстры Юрый Цымановіч (абодва Мінск), майстры Валерый Маркоўскі (Бабруйск), Уладзіслаў Сплендзер, Паліна Петрусёва (абодва Мінск), Валерый Разаеў (Мар'іна Горка). У жаночым турніры таксама па швейцарскай сістэме ў 7 тураў пяць запаветных пуцёвак у найвышэйшую лігу разыгралі 16 шашыстак. Паўышэнне ў класе на будучы год атрымалі Яна Якубовіч (Мінск, 11 ачкоў з 14 магчымых), Вікторыя Белая (Віцебск), Святлана Гарбачэнка (Мінск, у абедзвюх па 10 ачкоў). Па 9 ачкоў набралі мінчанкі Яна Лазовік і Вікторыя Нікалаева.

Сёння для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

Першыя дзве ў шашкі-64 і яшчэ адна ў шашкі-100.

№102

**Белыя простыя шашкі:** a5, b6, c1, c5, d6, f4, g5, h4 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** a7, b8, d2, d4, e3, e7, f8, g7, h6 (9).

№103

**Белыя простыя шашкі:** a3, a7, b2, d2, f4, g5 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** b6, c5, d6, f2, f8, g7 (6).

№104

**Белыя простыя шашкі:** 25, 29, 34, 35, 37, 41, 42, 43 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** 9, 10, 14, 15, 19, 26, 36 (7).

№102



Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс: З 27 лістапада па 3 снежня ў СДЮШАР-11 па шахматах і шашках (г. Мінск, вул. Ракаўская, 24) адбудуцца турніры 1-й лігі чэмпіянату Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын.

Праверце свае рашэнні: Выпуск №47 ад 06.10.2017.

№99 h6, b4, b8, g3, c5+

№100 d8, b6, b8, hf4, c1(f4,f4), f2+

№101 dc7, h8, b2, e5, h4(d4), g5(c3), c1+.

Правільныя адказы даслалі І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), А. Ліцьвінаў, В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н), А. Шчаглоў (Брэст).

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда».
E-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Пятніца, 27 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.50** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15** Зона Х (16+).
**9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).**
**13.10** Дзіцячы доктар.
**13.45** Дзень у вялікім горадзе.
**14.45, 15.25, 17.05 Серыял «Спявачка» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**21.00** Панарама.
**21.50** Клуб рэдактараў (16+).
**22.35 Меладрама «Каціна шчасце». 1—4-я серыі (16+).**
**2.15** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца (12+).
**9.00, 18.50** Тэлебарометр.
**9.05, 17.05 Серыял «Помста» (16+).**
**10.45** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**11.45 Серыял «Тут нехта ёсць: выкупленне». Заключныя серыі (16+).**
**13.50, 20.05** «Амерыканскі жаніх» (16+).
**15.20 Серыял «Іх перабылталі ў раддоме» (16+).**
**16.20, 0.05** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**18.55** «Паненка-сялянка» (16+).
**21.30** «Багіня шопінгу» (16+).
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10** «Бітва экстрасэнсаў. 16-ы сезон» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 13.15** «Беларуская кухня». Варэнікі з чарніцамі на казіным малацэ.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 14.05, 23.05** «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Маргарыта Назарава». Меладрама, заключная серыя (16+).**
**9.20, 14.10 «Куды ён падзенецца!» Маст. фільм (12+).**
**10.50** «Камертон». Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Віктар Клімчук.
**11.20, 17.55** «Легенды кіно». Аляксандр Збруеў (12+).
**12.20** «Вялікія мастакі». Каміль Пісаро (12+).
**13.40** «Сіла веры».
**13.55** «Партызаны». Канстанцін Заслонаў (12+).
**16.10, 21.05** «Час кіно». «Лістапад».
**16.15, 21.15 «Пасажырка». Маст. фільм (12+).**
**19.30** «Камертон». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Валерый Дайнэка.
**20.10** «Беларуская кухня». Хатні хлеб.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** «Песні пад гітару».
**23.15 «Утаймаванне сваволнага». Маст. фільм (12+).**

### Беларусь 5

**8.00** Авертайм.
**8.30** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. ХК «Гомель» — «Юнацтва-Мінск».
**10.30** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Ідэачасопіс.
**11.00, 14.30** Тэніс. WTA. Вынікі турнір. Сінгапур.
**13.00** Хакей. КХЛ. «Салават Юлаеў» (Уфа) — «Металург» (Магнітагорск).
**16.30** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**18.20** Хакей. КХЛ. «Ёкерыт» (Хельсінкі) — «Дынама-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**20.50** Спорт-цэнтр.
**21.00** Хакей для ўсіх.
**21.30** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Днепр» (Магілёў).
**23.30** Трэніровачны дзень.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!» (12+).
**10.10 Серыял «Замах» (16+).**
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), 21.00 Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.05** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**13.10, 23.40** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.20** «Час пакажа» (16+).
**16.20 Камедыя «Дзяўчына з гітарай» (12+).**
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.05** «Голас». Новы сезон (12+).
**23.00** «Што? Дзе? Калі?» на Беларусі» (16+).
**0.10** «Вячэрні Ургант» (16+).
**1.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 18.35** «Тайны Чапман» (16+).
**9.35, 17.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**10.40 «Водбліскі» Серыял (16+).**
**12.35** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Маст. фільм «Добрай раніцы!» (12+).**
**15.45** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.10** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** «Скардзіцца дазваляецца».
**17.10** «Адкрытая размова».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Узброены і небяспечны: асабістая зброя байцоў спецназа» (16+).
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**23.05** «Пад дахам навукі. Тайныя праекты спецслужбаў» (16+).
**23.55 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял (16+).**

### МІР

**6.35, 17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** М/ф (0+).
**9.20 Маст. фільм «Ах, вадзявіль, вадзявіль...» (0+).**
**10.40** «Любімыя акцёры» (12+).
**11.10 Маст. фільм «Пачатак» (12+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Хатняя прыслужніца» (16+).**
**14.25** «Іншы свет». (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**19.20 Серыял «Самазванка». (16+).**
**22.45, 5.15 Маст. фільм «Прыгоды Бураціна» (6+).**
**1.20** «Трымайся, шоубіз!» (16+).
**1.50** «Кашмар вялікага горада» (16+).
**2.20 Маст. фільм «Сюрпрыз» (12+).**
**3.55 Маст. фільм «Пары на каханне» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00, 20.40 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу .
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.10, 23.10** «Гумарына». (16+).
**0.20 Маст. фільм «Зоркі свецяць усім». (12+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.40, 23.30** «НЗ.by».
**10.20, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Ляснік». (16+).**
**12.05** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**16.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45** «Чакай мяне». (12+).
**20.40, 0.00 Серыял «Неўскі. Праверка на трываласць». (16+).**
**0.55 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 16.00** Для дзяцей «Адказвайка».
**7.30** «Раніца на восьмым».
**10.30** Дак. серыял «Дзецям пра звераняят».
**11.00 Драма «Бумер» (18+).**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне».**
**14.25 Камедыя «Дзяўчаты» (0+).**
**16.05** «Мультпарад».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**17.00** Дак. фільм «Святы кастрычніка» (0+).
**17.30 Серыял «Дарагі доктар» (16+).**
**18.55 Серыял «Выратаваць боса» (16+).**
**19.50 Серыял «11.22.63» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Ганна і кароль» (12+).**
**23.30 Серыял «Затрымка ў развіцці» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Варонікі». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Тры каты». (0+)
**8.00, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**8.20, 4.55** М/ф «Марынін і яго сябры». (0+)
**8.50, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30** Серыял «Сямейны бізнес». (12+).
**10.40** Камедыя «16 жаданняў». (0+).
**12.40** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00, 19.00** Серыял «Іванова—Івановы» (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Два бацькі і два сыны». (16+).
**16.45, 5.10** Серыял «Дзённік доктара Зайцавай». (16+).
**17.50, 23.10** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Камедыя «Чаго хочуць жанчыны». (12+).
**0.00** Камедыя «Супер Майк». (18+).
**2.00** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**6.35** Пернікавы домік. «Табар вяртаецца».
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Георгій Жжонаў.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.05** «Правілы жыцця».
**8.30** «Расія, любоў мая!» «Усяго тры струны».
**9.00** «Інтэрнат палкоўніка Кітова». Дак. фільм.
**9.40** Галоўная роля.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Актрыса». Маст. фільм.
**11.45** Сусветныя скарбы.
**12.00** Гісторыя мастацтва. Наталля Сямёнава. «Калыска рускага авангарда: Гаген, Маціс і Пікасо ў Маскве».
**12.55** «Энігма. Андрыс Нэльсанс».
**13.35** «Чароўнае правасуддзе Олівера Кромвеля». Дак. фільм.
**14.30** «Гісторыі ў фарфоры». Дак. серыял.
**15.10** Музычныя фестывалі Расіі. «Руская зіма».
**15.55** «Пісьмы з правінцыі». Сургут.
**16.25** Геніі і ліхадзеі. Оскар Барнак.
**16.50** «Тацяна Ліёзнава. Дажыць да светлай паласы». Дак. фільм.
**17.45** Вялікая опера — 2017. Кастынг.
**19.45** Смеханастальгія.
**20.15** «Лінія жыцця». Алег Басілашвілі.
**21.15** Кіно на ўсе часы. «Маленькая жанчына». Маст. фільм.
**23.35** «2 Вернік 2».
**0.20** «У Цэнтральным парку». Маст. фільм.
**1.50** «Шукальнікі». «Дойлід непабудаванага храма».
**2.40** «Архангельскія навелы». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. 2007 год (12+).
**7.00, 13.20, 19.20** Маст. фільм «12 крэслаў». (12+).
**8.05, 9.40, 12.55, 14.25, 15.40, 17.00, 18.55, 20.35, 21.40, 23.00, 0.55, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.45** «Народжаны ў СССР». 30-годдзе праграмы «Музычны ліфт». (12+).
**12.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». Гурт «Странные игры». 2-я частка (16+).
**16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**18.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1983. 3-я частка. 2009 год (16+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітко̆ўскім: «Гульня ў хіпі». 2006 год (16+).
**1.20** Тэлефільм «Вір». (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 10.30, 13.15, 17.00, 19.15, 0.50** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.
**4.30, 9.30, 14.30, 20.30** Веласпорт (трэк). «Шэсць дзён Лондана».
**6.00, 16.00** Watts.
**7.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**7.30, 16.30, 2.30** Футбол. «ФІФА».
**8.00** Футбол. Юнацкі чэмпіянат свету (U-17).

### Кінакамедыя

**0.50** Камедыя «Бінга Бонга». (16+).
**3.05** Прыгоды «Скарбы В.К.» (12+).
**5.05** Камедыя «Сутэнёр». (16+).
**6.55** Драма «Шэсць жонак Генры Ляфэя». (16+).
**8.35** Камедыя «Забойны агеньчык». (16+).
**10.25** Камедыя «Пятніца». (16+).
**12.00** Меладрама «Маленькая чорная кніжка». (16+).
**14.05** Камедыя «Ашаламляльныя фантазіі Чарлі Свона Трэцяга». (16+).
**15.40** Камедыя «Закахаць і абяскшкодзіць». (12+).
**17.55** Камедыя «М + Ж». (16+).
**19.30** Камедыя «Як снег на галаву». (16+).
**21.15** Меладрама «Развод паітальянску». (12+).
**23.15** Драма «Нягледзячы ні на што». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55** «Каралёк — птушачка пеўчая». Серыял (16+).
**10.30, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 5.10** «Паралельны свет» (12+).
**15.15** «Трэндзі» (16+).
**15.45** «Здзелка» (16+).
**16.15, 2.30** «Рыжыя» (16+).
**17.10** «13 знакаў Задыяка» (12+).
**18.10, 1.40** «Бітва рэстаранаў» (16+).
**19.10, 0.50** «Гучныя справы» (16+).
**20.10** «Прыкінься маёй жонкай». Камедыя (12+).
**22.10** «Савецкія мафіі» (16+).
**22.55** «Успомніць усё». Фантастыка (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.40** Эрын Брокавіч — прыгожая і рашучая (16+).
**8.40** Дварэцкі (16+).
**11.15** Усмешка Моны Лізы (12+).
**13.35** Агент пад прыкрыццём (12+).
**15.30** Холад у ліпені (16+).
**20.10** Белаcнежка: помста гномаў (12+).
**22.15** Зомбі па імені Шон (16+).
**0.15** Супер Майк (18+).
**2.25** Асуджаныя заручаныя (16+).
**4.05** Галодныя гульні: сойкаперасмешніца. Частка І (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Няўлоўныя. Джэкпот. (16+).
**8.00** Першы пасля бога. (16+).
**10.00** Закахаць і абяскшкодзіць. (12+).
**12.15** Ганна на шыі. (12+).
**14.05** Анёлы рэвалюцыі. (16+).
**16.20, 4.20** Замуж пасля ўсіх. Серыя 1—2. (12+).
**18.20** Службовы раман. Наш час. (16+).
**20.20** Старыя клячы. (12+).
**22.55** ПіраМММіда. (16+).
**1.05** Перакладчык. (16+).
**2.40** Няўлоўныя. Апошні герой. (16+).

### National Geographic

**6.00** Зрабі або памры. (12+).
**6.25** Код небяспекі. (12+).
**6.50** Папулярная навука. (12+).
**7.35, 13.25, 20.15, 22.30, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.00, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.10** Ледзяная дарога. (12+).
**9.35, 16.25, 19.30, 0.00, 2.20** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**11.55** Аўта-SOS. (12+).
**12.40** Космас: прастора і час. (12+).
**15.40** Асушыць акіян. (12+).
**17.10** Неверагодныя машыны. (12+).
**18.00, 21.00, 0.45, 3.55 1917-ы:** адзін год — дзве рэвалюцыі (16+).
**18.45, 1.30, 4.45** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас. (16+).
**21.45** 80-я. Найвялікшыя спартсмены (12+).
**23.15, 3.10** Эвакуацыя Зямлі. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Горная брыгада. (16+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**11.00** Апошнія жыхары Аляскі. (16+).
**14.00, 5.30** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (12+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Браты Дызель. (16+).
**0.00** Разбуральнікі легенд. (16+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (16+).
**2.00** Самагоншчыкі. (18+).
**2.55** Мяцежны гараж. (16+).




## НАЙЛЕПШЫ «НАСТАЎНІК» ГОДА

Гэтай дзяўчынцы, мусіць, трэба было нарадзіцца хлопчыкам. Людка — смелая і дзёрзкая — змалку была завадатаркай ці, дакладней, «затычкай да кожнай бочкі». Уся акруга ведала, што яна першая ў розных хлапечых гульнях, першая ў бойках, першая ў налётах на чужыя сады-агароды, першая, на жаль, і ў прагулах урокаў...

Што з гэтым рабілі бацькі? Прасцей расказаць, чаго не рабілі: і ўпрошвалі яе, малую, і ўгаворвалі, і нешта абяцалі, і страшылі... А не дзейнічала нічога, нават папруга, якую бацька павесіў на сцяне як намёк, што болей размоў ужо не будзе.

Падыход да гэтай «цяжкай» дзяўчынкі спрабавалі знайсці і асобныя настаўнікі, але ж большасць іх проста махнулі рукой. Нават горш за тое — на Люду стараліся павесіць і яе грахі, і чужыя.

— Шаўцова, чаму дошка нямытая? — штораз пытала ў яе класная кіраўніца.

— Дык не я ж дзяжурная, — спрабавала адбіцца дзяўчынка.

Але марна: менавіта ў яе класная заўсёды пытала, чаму некага ў школе няма, чаму кніжкі ляжаць не там, дзе павінны, чаму фортка ў класе адчынена (альбо зачынена)

«Ды што яна ўсё чапляецца? Колькі можна?» — абуралася дзяўчынка. Цярпенне яе было на мяжы: яна думала, што з гэтым трэба нешта рабіць, але што?

План помсты падказаў выпадак: у лузе (смеласці ды лоўкасці было не пазычаць) Люда злавіла вужа, засунула яго за падкладку пінжака і з'явілася на ўрок да класнай: праўда, са спазненнем...

Гэтага было дастаткова, каб распачаць чарговы разнос:

— Шаўцова, дзе ты шляешся замест таго, каб быць на ўроку?! Што ў цябе пад пахай?

Слухаць далей Люда не стала. Яна падышла да стала, выцягнула вужа і паклала яго перад настаўніцай.

Што пачалося, — не расказаць! Класная закрычала, заверашчала, дзеці — таксама, нехта пабег з класа, нехта — напрасткі да дырэктара...

Той нібы віхар пранёсся па калідоры, уляцеў у клас, ні ў кога нічога не пытаючы, схапіў Людку за вуха і вывеў са школы.

— Вон! — сказаў. — І каб духу твайго не было. Бацькі няхай прыйдуць.

Так што іншага выйсця не было: дзяўчынцы прыйшлося расказаць пра ўсё дома.

Бацька выслухаў і, здаецца ж, зразумеў яе, але папругу са сценкі зняў...

Пасля гэтага ў сваю старую школу Люда больш не вярнулася. А ў новай адчайную ды здольную да вучобы дзяўчынку адразу ж прывецілі, заўважылі. Настаўнікі час ад часу сталі яе нахвальваць, вучні — звяртацца па дапамогу...

Так ці іначай, Люда паспяхова скончыла школу, паступіла ў інстытут, стала добрай бухгалтаркай, эканамістам. Але ж пры выпадку ўсім расказвае, што як ні круці, а найлепшым «настаўнікам» для непаслухмяных заўсёды быў і будзе бацькоўскі рэмень.

**Ніна Бурко,**
*г. Беразіно.*

## СУСТРЭНЕМСЯ НА... ЭКЗАМЕНЕ

Чыстая праўда, нічога не прыдумала.

Еду, значыць, я ў аўтобусе, салон перапоўнены, але ж я неяк села. Жанчына сярэдняга веку побач са мной стаіць, хоць, відавочна, ёй таксама хацелася б сесці... А перад ёю яшчэ дзяўчо — модніца нейкая, з пірсінгам на ніжняй губе. «Маладое, дурное...» — падумала я пра гэту дзяўчыну і, як высвятляецца, не памылілася. Справа ў тым, што побач з'явілася свабоднае месца, тая жанчына, памкнуўшыся сесці, папрасіла дзяўчыну:

— Дайце прайсці...

— Больш ты нічога не хочаш? — нават не зварухнуўшыся, агрызнулася тая.

— А мы хіба на «ты»? Блізка знаёмы ці сваякі? — здзівілася жанчына. (Вольнае месца ўжо занялі, спяшацца не было куды...)

— Ды пайшла ты... — у адказ ёй заявіла модніца, паказаўшы пры гэтым, што завушніца ў яе не толькі на губе, але і на... языку!

Такое, згадзіцеся, убачыш нячаста, а ўбачыўшы, наўрад ці забудзеш. Вось і жанчына, разглядаючы сваю крыўдзіцельку, здзіўлена прамовіла:

— Вой, а я ж вас, здаецца, ведаю. Вы з трэцяга курса, так? У наступным семестры я ў вас буду лекцыі чытаць. Так што мы з вамі яшчэ сустрэнемся, праўда? І размову нашу абавязкова прадоўжым — на экзамене.

Тым часам наш аўтобус пад'ехаў да наступнага прыпынку. Модніца, як той рак, чырвоная, моўчкі рванула да выхаду. А мы з жанчынай міжволі ўспомнілі стары анекдот: у казарме стаяць два сябрукі. «Слухай, давай над нашым старшынёй прыколемся?» — прапануе першы. «Над дэканам ужо прыкалоліся... Табе што — мала?»

**Наталля Шастакова,**
*г. Гомель.*

## ПАШЧАСЦІЛА

У цырульнях гэтак здараецца: кліентка, якая запісалася на стрыжку, у прызначаны час не прыйшла, наступная за ёй — на прычоску — з'явілася крыху раней і майстар адразу ж усадзіла яе ў мяккае крэсла, абхінула цёмнай доўгай накідкай, спытала:

— Як робім?

— На макаўцы вышэй, на скронях трохі пышней, ніз гладкі, — адказала стомленая жанчына і ў асалодзе заплюшчыла вочы: рэдкія паходы ў цырульню былі для яе хвілінамі адпачынку.

Майстар тым часам заляпала нажніцамі. «Напэўна, нейкія пасмачкі выбіваюцца? — падумала кліентка. — Малайчына, няхай падраўнее, прыбярэ». Сама ж яна (дзе яшчэ вось так пасядзіш?) працягвала «кайфаваць» — атрымліваць асалоду, пакуль не зразумела, што яе... грунтоўна стрыгуць...

Казаць, што яна не для гэтага прыйшла, было відавочна позна. «Што будзе, тое будзе», — здалася кліентка не то на волю лёсу, не то на майстэрства цырульніцы.

— Усё! Стрыжка гатова! — сказала неўзабаве тая.

— Але ж я запісвалася на прычоску.

— Як на прычоску?! — спалохалася майстар. — І што зараз рабіць?

— Ды выбару як быццам няма: прычоску.

...Карацей — завяршылася гэтае непаразуменне добра: і стрыжка, і ўкладка ўдаліся на славу. А яшчэ было трохі смеху, што таксама нядрэнна, бо кажуць, што ён падаўжае жыццё.

**Фаіна Касаткіна,**
*г. Паставы*

## АНГЛІЙСКІ КАМПОТ

Не ведаю, як для каго, а для мяне «крыніцай» новых баек з'яўляюцца... старыя. Мяркуйце самі: выйдзе ў «Звяздзе» чарговы «Провад», сябры-знаёмыя пачытаюць, глядзіш, нехта скажа: «Во, а ў мяне ж таксама было...» І выкладзе гатовы сюжэт.

Ну вось напрыклад: я пісала нядаўна (гл. «Звязда» ад 13.10), як адзін наш дзядуля хацеў доктара частаваць, як свае зубныя пратэзы са шклянкі выняў, а яму гарэлкі туды... Дык цётка Пашка (маці маёй сяброўкі) з гэтай нагоды генеральскія зубы ўспомніла.

Але ж пра іх — потым, спачатку пра цётку трэба.

Ёй, ПраскоўіАнуфрыеўне (дарэчы, таксама падпісчыцы «Звязды»), у гэтым годзе 95 стукнула. Усю апошнюю вайну яна медыкам прайшла. І не абы-дзе, а на флоце, у Мурманску, куды немцы рваліся з усіх сіл, бо там — паўночныя марскія шляхі...

Бамбілі, карацей, амаль штодня, тапілі англійскія гуманітарныя грузы, не зважалі нават на шпіталі, хоць там, на дахах, чырванелі крыжы і, паводле міжнародных канвенцый, бамбіць такія аб'екты нельга. Але ж гэта — нармальным праціўнікам, а не фашыстам. (Дарэчы, нейк яны скінулі бомбы, ніводная не разарвалася. Сапёры потым казалі, што замест смяротнай «начынкі» там быў проста пясок і запіска: «Чым змаглі — памаглі». Гэтак (з рызыкай для жыцця) набліжалі перамогу нашы палонныя, якія працавалі на нямецкіх заводах.)

І лётчыкі (прычым з абодвух бакоў) лягалі над Мурманскам самыя-самыя, звычайна — афіцэры, асы.

Але ж іх збівалі таксама. Нямецкіх, тых, што выжылі, бралі тады ў палон, трохі падлечвалі і «здавалі» чынам з НКДБ. Яны, гэтыя «высокія шышкі з высокіх органаў», як іх цётка Пашка назвала, увесь час там «дзяжурылі». Таму загрымець «на пажыццёвае з расстрэлам на «фінішы» было што раз плюнуць...

Ледзь не трапіла пад трыбунал і цётка, Пашка.

...Недзе ў 1943-м да іх у шпіталь збіраўся прыляцець сам камандуючы Паўночным флотам адмірал Галаўко. А папярэдне — прыбыў генерал, начальнік медслужбы флоту, і распачаў там такую дзейнасць...

Праўда, сілы не разлічыў, — з язвай зваліўся».

Такога вось рэдкага пацыента адразу паклалі ў асобную палату, забяспечылі адмысловым харчаваннем. І догляд патрабаваўся такі ж — персанальны, з боку не менш чым фельчара і лейтэнанта Праскоўі.

Трэба сказаць, што службу гэта дзяўчына заўсёды несла сумленна.

Аднойчы, калі генерал «адпачывалі», яна ціхенька зазірнула ў яго «апартаменты» і згледзела на століку шклянку: як ёй падалося — з недапітым кампотам. Нешта ў ім яшчэ плавала? Падумала: можа, заморскія фрукты? Але ж раз генерал не дапіў і адразу не з'еў, то, значыць, напой не спадабаўся і дапіваць яго ён не будзе — новы прынясуць...

А таму вось гэты яна хуценька занесла ў памыйніцу, у спецыяльны бак для адходаў.

Плюхнула і забылася б, але ж у аддзяленні пачаўся гвалт:

— Дзе мае зубы?! — ва ўсё горла крычаў генерал.

— ?!

А яго ніхто не разумеў, бо пратэзаў тады і ў вочы не бачылі!

Думалі б, што ў чалавека нешта з галавой (розумам крануўся), але зубы ў яго і праўда зніклі — усе, хоць нядоечы былі...

І гаварыў ён раней нармальна, а цяпер толькі шамкаў ды пырскаўся слінай...

Пабеглі да начальніка шпіталя. Ён тут жа прынёсся са світай дактароў, і генерал ужо ім роў:

— Пад трыбунал!.. Усіх расжалую! Вы ў мяне ў санітары пойдзеце!.. Дзе мае зубы?

Каб супакоіць яго, давялося ледзь не сілком увесці дзве дозы заспакаяльнага, пачакаць, пакуль падзейнічае, і толькі тады папрасіць:

— Калі ласка, скажыце, а што канкрэтна значыць пытанне "Дзе мае зубы?»

— Ды пратэзы ў мяне, балван, — прашамкаў заспакоены генерал начальніку шпіталя. — Яны вось тут у шклянцы стаялі.

Пачуўшы гэта, лейтэнант Праскоўя куляй паляцела на памыйнік.

На яе вялікае шчасце, змесціва бака ніхто не выкінуў і тое, што ў мутнай шклянцы яна прыняла за скрылікі фруктаў, па-ранейшаму ляжала зверху.

Дзяўчына хуценька паднялa іх, вымыла, прадэзынфікавала і на дрыготкіх нагах занесла хвораму.

Такім чынам, бура, трохі заціхшы, больш не ўсчыналася: генерал супакоіўся, шпіталь уздыхнуў з палёгкай. А ўжо Праскоўя...

Паводле афіцыйнай версіі, зубны пратэз яна брала на санапрацоўку, а своечасова не прынесла, бо не паспела — хворы прачнуўся раней.

...Карацей, нікому і ніколі яна не расказвала, дзе — канкрэтна — пабывалі тыя генеральскія зубы. Грыф сакрэтнасці зняў звяздоўскі «Провад», на 73-м годзе пасля Перамогі.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# ПРЫВАТНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА



### Сядзіба з агародчыкам: мэта жыцця дасягнута?

Дачны сезон закончыўся. Стаяць, настываюць сярод халоднага туману прыціхлыя хаты з завешанымі фіранкамі вокнамі, красуюць каля іх шыкоўныя букеты бабінага лета, на якія няма каму любавацца. Вёска апусцела, па ўсёй доўгай вуліцы вечарам рэдка дзе ўбачыш дым над комінам ды агеньчык у акне, дый той хутка згасае: старыя людзі рана кладуцца спаць. Праедзе толькі якая машына разы два на дзень — і зноў цішыня, такая пранізлівая, што чуваць, як кладзецца на зямлю рудаваты ліст, што плаўна спусціўся з суседская клёна.

Такая вось восеньская сумнаватая карціна. Адзінае, што радуе, — вёска ўсё роўна жывая, дый не памрэ, пэўна, ніколі. Занядбаных хаты, якія падлягаюць зносу, — гэта не пра нас. Нерухомасць, няхай сабе і 1925 года пабудовы з неабшаляванымі сценамі, за нейкія сорак кіламетраў ад Мінскай кальцавой, — сёння ў цане. Такую хату спадчыннікі прадаюць за шэсць тысяч долараў. Праўда, патэнцыйныя пакупнікі ездзяць-ездзяць, а не купляюць. Але гэта пакуль. На вясну, ды яшчэ калі ў гаспадароў хопіць розуму цану знізіць, ахвотныя абавязкова знойдуцца. Не кажу ўжо пра пустыя незабудаваныя ўчасткі — сёлета раскупілі амаль усё, нават будоўлю распачалі. Час мяняецца, а коласаўскае «зямля не зменіць і не здрадзіць» для беларусаў застаецца ці не галоўным па жыцці дэвізам, прычым маецца на ўвазе менавіта ўласны агарод, хай сабе і ўсяго на шасці сотках...

Нядаўна ў рэдакцыю пісьмо прыйшло ад шматгадовых нашых падпісчыкаў з Гродзеншчыны. Шаноўная Ніна Іванаўна ў апошніх яго радках зрабіла прыпіску: маўляў, не трэба яго друкаваць, я не скарджуся, проста паразмаўляла са сваёй газетай аб набалелым. Але, паколькі ў допісе ёсць ідэя, якую не магу не агучыць, дазволю сабе ўсё ж некаторыя радкі працытаваць (спадзяюся, іх аўтарка на мяне за тое не пакрыўдзіцца).

Вёска, у якой жыве Ніна Іванаўна, знаходзіцца ў маляўнічым месцы. Раней тут было ўсё: «школа, клуб, бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі, магазін, цэнтр калгаса». Цяпер з усяго пералічанага застаўся адзін магазін, дый жыхароў для былога цэнтра калгаса няшмат — нейкіх паўтары сотні чалавек. Пошту возіць машына, кнігі — бібліёбус (раз на паўгода), на ФАПе пяты год няма медработніка, клуб як дом культуры не дзейнічае, будынак былой калгаснай канторы стаіць пусты. «Не прымеце гэта ўсё як скаргу, — піша аўтарка ліста, — з усімі выцякаючымі рашэннямі. Гэта бяда не толькі нашай вёскі — час такі настаў». І далей — з-за чаго, уласна кажучы, я і асмелілася гэта пісьмо працытаваць: «Каб знайшоўся добры гаспадар, узяў у арэнду ці купіў усе пустуючыя пабудовы ў вёсцы, пераўтварыў бы яе ў зону адпачынку. Тут жа такое маляўнічае месца — і рэчка ёсць, і сажалка, дзе рыбу разводзілі, і крыніцы з чыстай крыштальнай вадой...»

Упэўнена: так пра свае родныя мясціны могуць сказаць жыхары любой «неперспектыўнай» вёскі. І менавіта ў іх, «неперспектыўных», сёння якраз перспектывы і ёсць. Тыя самыя, пра якія і піша Ніна Іванаўна. Галоўнае, каб для кожнага паселішча знайшоўся, як паважліва называе наша чытачка, «гаспадар». Чалавек, які хоча жыць і працаваць на зямлі і які не пабаіцца ўкласці ў яе развіццё свае сродкі.

Здаецца, і нямала ў нас такіх людзей. Чаму ж тады мы з ахвотай купляем сядзібу з агародчыкам для сябе, а далей думкі і памкненні, нават пры наяўнасці сродкаў і магчымасцяў, не сягаюць? Спрыяльных умоў і прэферэнцый для адкрыцця сваёй справы на вёсцы, асабліва пасля падпісання апошнім часам адпаведных прэзідэнцкіх указаў, больш чым у каго іншага. Чаго ж тады не хапае?

Напэўна, элементарнай смеласці. Пачынаць справу на закінутым будынку ці ўвогуле на пустым месцы складана і рызыкоўна. Цяжка ўявіць, што нешта атрымаецца, што балота ператворыцца ў луг, што завірує жыццё там, дзе яно некалькі дзесяцігоддзяў згасае...

Нядаўна ў рэйтынгу найлепшых месцаў адпачынку ў СНД у першай дзясятцы аказаўся парк актыўнага адпачынку "Якуцкія горы". Гэта на маёй радзіме, ля вёскі Якуты. Гадоў дваццаць назад мы ўсе са скептычным недаверам назіралі, як хлопцы з мясцовымі каранямі вырашылі ўкласці свой капітал у, здавалася б, безнадзейную справу. Бо «горы» літаральна імі і былі — проста высокія пагоркі сярод лесу побач з «неперспектыўнай» вёскай. Спачатку там зрабілі лыжную трасу з пад'ёмнікам, пасля пабудавалі гасцявы дом, дзе можна было зладзіць вяселле і юбілей на прыродзе, невялікі гатэль. Не адразу — за два дзесяцігоддзі, пакрысе. Снегаходы, квадрацыклы, пейнтбол, лазербол, з дзясятак розных атракцыёнаў, экстрэмальныя камандныя гульні... Адпаведна — і наведвальнасць, і прыбытак, і рэклама, і высокі рэйтынг. І працоўныя месцы для жыхароў вёскі, якую яны самі наўрад ці назавуць сёння неперспектыўнай. За ўсім гэтым — гады пастаяннай упартай працы мэтанакіраваных людзей, якія і не спадзяваліся, што будзе лёгка.

Скажаце, хутчэй выключэнне, чым правіла? Яно ці не стане ў нашай свядомасці правілам, і ніякія прэферэнцыі не дапамогуць, пакуль большасць з нас не навучыцца глядзець трошкі далей, чым праз плот утульнага маленькага агародчыка.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

Утерянный бланк страхового полиса формы 2РН серия КЕн №0045053 считать недействительным.

УНП 100985903

Утерянные страховые полисы по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА №№1146742, 1156795, 1216522 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» считать недействительным.

УНП 100357923

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

## Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2.
Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by в разделе «Финансовые показатели»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2017 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 81 967 | 75 412 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 496 | 505 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 261 955 | 65 151 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 127 882 | 144 690 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 013 425 | 988 891 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 213 504 | 1 662 626 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 133 | 8 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 572 | 539 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 169 807 | 171 752 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 12 254 | 9 497 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | – | – |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 34 489 | 33 648 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | | **3 916 484** | **3 152 719** |
| | | | | | |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | – | 40 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 820 704 | 789 322 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 2 557 058 | 1 821 842 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 83 595 | 70 647 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 296 | 534 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | – | – |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 14 307 | 19 036 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 3 475 960 | 2 701 421 |
| | | | | | |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 189 357 | 189 357 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | – | – |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 46 300 | 40 872 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 29 156 | 30 752 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 175 711 | 190 317 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 440 524 | 451 298 |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **3 916 484** | **3 152 719** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2017 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 218 605 | 267 515 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 99 730 | 132 799 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | | 118 875 | 134 716 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 44 853 | 35 782 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 9 443 | 9 416 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | | 35 410 | 26 366 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | (928) | 580 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 49 | 2 595 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 36 535 | 32 551 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (201) | (374) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 33 963 | 42 037 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 8 350 | 4 376 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 108 636 | 71 349 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 5 381 | 5 304 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 50 110 | 82 120 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 5 354 | 5 387 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **44 756** | **76 733** |

Председатель правления В. Д. Бабарико

Главный бухгалтер И. О. Потапова

Дата подписания: 3 октября 2017 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности №8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013. УНП 100429079

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 47-20-56.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 3 года земельного участка с кадастровым №240100000002009271 площадью 0,0145 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Транспортная для строительства объекта «Модульная мастерская шиномонтажа по ул. Транспортная в г. Витебске». Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена**: 437,35 бел. руб. **Задаток:** 43,74 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: 24.11.2017 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 20.10.2017 с 8.30 по 23.11.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Реквизиты для внесения задатка: р/с BY14AKBB36423020002802000000 в ф-ле №200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. Условия аукциона: заключить с Витебским горисполкомом договор аренды зем. участка; возместить в установленном порядке убытки, причиняемые Витебскому городскому исполнительному комитету, в связи со сносом, расположенных на зем. участке, объектов недвижимости, в сумме 416 бел. руб. в денежных знаках образца 2009 года; получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца, с момента гос. регистрации права на зем. участок; при необходимости привлечь инженерную организацию (инженера) для оказания инженерных услуг в строительстве в порядке и на условиях, предусмотренных законодательством и договором на оказание инженерных услуг |

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Условия аукциона:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за право заключения договора аренды зем. участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением документации, необходимой для его проведения. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. **Для участия в аукционе** граждане, индивидуальные предприниматели и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

Директор ООО «Арбитр» Долгов Р. С. сообщает, что собрание кредиторов по защите требований Гродненского областного потребительского общества в сумме 42 462 рубля 32 копейки по делу №3-10б/2015 о банкротстве в отношении ООО «Западспецстрой» (591500896) состоится 08.11.2017 г. в 14.10 (в помещении экономического суда Гродненской области по адресу г. Гродно, ул. Советских пограничников, 102, холл 1-го этажа). Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями можно по адресу управляющего ООО «Арбитр»: г. Гродно, ул. Суворова, д. 127, корп. 5, к. 411, тел. 8 0152 530715.

УНП 590995276

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в аг. Барсуки, дер. Калюга, дер. Белая Лужа, дер. Замлынье Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **22 ноября 2017 года, в 10.00** г. Жодино, пер. Молодежный, 3, Жодинский сельисполком, кабинет №1 |
| 3 | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот №1** – земельный участок №18 площадью 0,15 га с кадастровым номером 624881701101000436 в аг. Барсуки.<br>**Лот №2** – земельный участок №1 площадью 0,1360 га с кадастровым номером 624881707501000109 в деревне Калюга.<br>**Лот №3** – земельный участок площадью 0,1498 га с кадастровым номером 624881706601000060 в деревне Замлынье.<br>**Лот №4** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000120 в деревне Белая Лужа, ул. Магистральная |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная цена продажи | **Лот №1** – 16 000,00 рублей<br>**Лот №2** – 5 500,00 рублей<br>**Лот №3** – 3 000,00 рублей<br>**Лот №4** – 4 000,00 рублей |
| 8 | Условия проведения аукциона | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.<br>Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот №1 (электроснабжение, газоснабжение) |
| 10 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ №616 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк»<br>г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12 | Окончательный срок приема заявлений | 17 ноября 2017 года до 17.00 |
| 13 | Контактные телефоны | 8 01775 35-449, 8 01775 37-174, 8 01775 37-189 |

Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: земельный участок в земельный участок в аг. Барсуки – 1 766,78 рублей, земельный участок в д. Замлынье – 1 657,92 рублей, земельный участок в дер. Калюга – 1 652,57 рублей и земельный участок в д. Белая Лужа –1 444,83 рублей (без учета стоимости информационного сообщения).

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо)

## ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 22 ноября 2017 года в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20 открытого аукциона по продаже выявленного, задержанного, арестованного и обращенного в доход государства имущества

| № лота | Наименование объекта | Уполномоченный орган | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. №334/С-9739, площадью 3 114,3 кв. м**, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – **здание главного корпуса**. Местонахождение: **Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Советская, д. 96/3.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **322855100001001254,** общей площадью **8,8850 га (право постоянного пользования)**. Ограничение (обременение): **ипотека** | ИМНС РБ по Житковичскому р-ну | **371 700,00** | 37 170,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. №330/U-(не присвоен), площадью 260,0 кв. м (наружная)**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **незавершенное незаконсервированное капитальное строение**. Местонахождение: **Мозырский р-н, Козенский с/с, д. Наровчизна, ул. Ракитского П. Ф., д. 17.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **323581203601000417,** общей площадью **0,1051 га (частная)** | ОПИ Мозырского р-на | **29 070,00** | 2 907,00 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. №322/С-17783, площадью 1 256,5 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное административное кирпичное здание с тамбуром, цехом сборки и смотровой ямой**. Местонахождение: **г. Рогачев, ул. А. С. Пушкина, 69.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **324750100002001239,** общей площадью **0,6143 га (право постоянного пользования)** | ИМНС РБ по Рогачевскому р-ну | **188 190,00** | 18 819,00 |
